# Далучыцца да культуры Усходу

**Выстаўка «Сучаснае мастацтва Пакістана», прысвечаная 75-годдзю незалежнасці гэтай краіны, адкрылася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Яна пазнаёміць з адметнай культурай, унікальнай спадчынай, старажытнымі ўсходнімі традыцыямі.**



*Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Ісламскай Рэспублікі Пакістан у Рэспубліцы Беларусь Саджад Хайдэр Хан.*

— Пакістану як дзяржаве ўсяго 75 гадоў, аднак гісторыя нашай зямлі ўзыходзіць да 7 тысяч год да нашай эры, — адзначыў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Ісламскай Рэспублікі Пакістан у Рэспубліцы Беларусь Саджад Хайдэр Хан. — Размешчаная на лініях палітычнага разлому, якія пастаянна змяняюцца, зямля сучаснага Пакістана застаецца сэрцам рэгіянальнай геапалітыкі з перакрыжаваным узаемадзеяннем культур і мастацтваў на працягу многіх тысячагоддзяў. Пакістан — шматкультурнае, шматэтнічнае і шматмоўнае грамадства. Ён мае багатую гісторыю ва ўсіх відах выяўленчага мастацтва — у жывапісе, архітэктуры, тэкстылі, дэкаратыўна-прыкладным мастацтве і скульптуры.

У экспазіцыі прадстаўлены мастацкія работы выдатных пакістанскіх мастакоў. Каліграфія Аішы Камаль вылучаецца дэталёвасцю і дакладнасцю, у ёй паўстае карункавая прыгажосць і вытанчаная энергія жыцця, нараджаецца спляценне колераў, адценняў, форм, сімвалаў і метафар. Саед Садэквайн — мастак і паэт, аўтар тысяч унікальных прац, прызнаных ва ўсім свеце. Яго складаныя мастацкія вобразы, сімфонія колераў, прадуманая кампазіцыя, філасофскія тэмы, неардынарныя сюжэты ўражваюць актуальнасцю.

Творы Нарын Саджыд адрозніваюцца яркімі колерамі, сімвалічнай глыбінёй, арыгінальнымі спалучэннямі і кантраснымі вобразамі. Здымкі вядомага фатографа Хаміда Хусэйна прадстаўляюць Пакістан ва ўсёй яго турыстычнай пышнасці: захапляльныя панарамы гарадоў і знакамітых горных вяршынь, азёрныя краявіды, пешаходныя маршруты і архітэктурныя славутасці. Экспазіцыю дапаўняюць прадметы быту: драўляныя скрыначкі, сталовыя прыборы, сурвэткі, дэкаратыўныя ўпрыгажэнні з оніксу, традыцыйнае адзенне, скульптуры.

На адкрыцці выстаўкі адбылася ўрачыстая цырымонія перадачы ў дар Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі каля 30 выданняў па гісторыі, традыцыях, рэлігіі, мастацтве Пакістана, а таксама мастацкай, дзіцячай і даведачнай літаратуры аб усходняй краіне. Пазнаёміцца з выстаўкай можна у галерэі «Атрыум» да 6 ліпеня.

**Дзіяна КАЗІМІРЧЫК**
**Фота з сайта НББ**